Фактычная рэтраспекцыя прамой актуалізацыі мінулых падзей рэпрэзентуецца з дапамогай лексічных адзінак рэтраспектыўнага значэння з семай *памяць*: *Лявон здзівіўся: ён* ***успомніў****, што гэтая дывізія годам раней, у чэрвені 1919 года была ў Запалонным, ідучы ўслед за адступаючымі войскаміКалчака*(«Вяртанне»).

Фактычная каўзальная рэтраспекцыя рэпрэзентуецца на аснове каўзальных адносін. Рэтраспектыўная частка змяшчае прычыну ажыццяўлення або нерэалізацыі дзеянняў, падзей сучаснасці: *Аднойчы Сапляк завітаў у Пруску. <...> Цікавілі яго, мусіць, паны Падгурскія. Зрэшты, нетакяны, якіх золата. І вось спазніўся–надзеньякі:* ***Падгурскія зніклі, прыхапіўшы з сабой, напэўна, і золата...*** («Вяртанне»).

Выяўлена, што маркерам мінулых падзей у адносінах да папярэдняга выказвання выступаюць колькасна-іменныя спалучэнні, словазлучэнні з рознымі кампанентамі, прыслоўі часу. Каўзальная рэтраспекцыя таксама набывае форму розных відаў складаных сказаў – складаназалежных, бяззлучнікавых, камбінаваных сказаў: *Акрамя таго, ён (Кірыла) прыкметна накульгваў на левую нагу:* ***у дзяцінстве паслізнуўся на лёдзе і ўпаў, пасля таго левая нага ў росце крыху адстала ад правай*** («Уліс з Прускі»).Як бачым, рэтраспектыўны план змяшчае прычыну ажыццяўлення падзей папярэдняга выказвання, якое выступае ўмоўнай кропкай адліку. Трэба адзначыць, што ў пераважнай большасці адсыл у мінулае ажыццяўляецца ўнутры блокаў з бяззлучнікавай сувяззю на аснове прычынна-выніковых адносін.

**Заключэнне.**Такім чынам, у ходзе даследавання былі вылучаны прыёмы кампазіцыйна-тэкставай рэтраспекцыі – намінатыўны, інфармацыйнага дапаўнення, супастаўлення, параўнання, прамой актуалізацыі мінулых падзей, каўзальны. Вылучаны розныя маркеры рэтраспекцыі на лексіка-граматычнымузроўні. Як бачым, тэкставая катэгорыя рэтраспекцыі патрабуе больш дэталёвага вывучэння, а менавіта вызначэння іншых прыёмаў яе актуалізацыі, выяўлення сродкаў выражэння.


1. Брускова, Н. В. Категории ретроспекции и проспекции в художественном тексте: на материале немецкого языка : автореф. дис. ... канд. филол. наук : 10.02.04 / Н. В. Брускова ; Моск. гос. пед. ин-т иностр. яз. – М., 1983. – 22 с.
2. Тивьяева, И. В. Ретроспективные сверхфразовые единства: формы и функции : дис. ... канд. филол. наук : 10.02.04 / И. В. Тивьяева. – Тула, 2007. – 175 с.
3. Федорова, Л. Н. Категория ретроспекции в художественном тексте: на материале английского языка : автореф. дис. ... канд. филол. наук : 10.02.04 / Л. Н. Федорова ; Моск. гос. пед. ин-т иностр. яз. – М., 1982. – 21 с.
4. Чиговская-Назарова, Я. А. Текстообразующие категории проспекции и ретроспекции в научном тексте (сравнительно с художественным) / Я. А. Чиговская-Назарова // Вестн. Перм. ун-та. Рос.изарубеж. филология. – 2009. – № 6. – С. 31–34.
5. Брускова, Н. В. Асимметрия оппозиции категории ретроспекции и проспекции / Н. В. Брускова // Системный и функциональный анализ языка : межвуз. сб. науч. тр. / Латв. гос. ун-т ; редкол.: Б. Л. Лихтерова (отв. ред.) [и др.]. – Рига, 1987. – С. 19–24.
6. Чиговская-Назарова, Я. А. Формы взаимодействия текстовых категорий проспекции и ретроспекции в научном дискурсе / Я. А. Чиговская-Назарова // В мире науки и искусства: вопр. филологии, искусствоведения и культурологии. – 2014. – № 37. – С. 71–74.
7. Лифантьева, Е. В. Реализация текстовой категории ретроспекции в англоязычном художественном тексте : автореф. дис. ... канд. филол. наук : 10.02.04 / Е. В. Лифантьева ; Тул. гос. ун-т. – М., 2009. – 17 с.


## НАЗВЫ КАМЯНЁЎ НА ТЭРЫТОРЫІ ВІЦЕБШЧЫНЫ: СЕМАНТЫЧНЫ АСПЕКТ


***Драба І.А.,***
*студэнтка 3 курса ВДУ імя П.М. Машэрава, г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*
*Навуковы кіраўнік –* ***Семянькова Г.К.,*** *канд. філал. навук, дацэнт*



Ключавыя словы. Анамастыка, тапаніміка, мікратапаніміка, мікратапонім, семантыка.
Keywords. Onomastics, toponymy, microtoponymy, microtoponym, semantics.


Чалавеку здаўна ўласціва даваць назвы розным прадметам, геаграфічным аб’ектам. Менавіта такімі назвамі займаецца мікратапаніміка – кірунак тапанімікі, які вывучае мікратапонімы –неафіцыйныя назвы лясоў, лугоў, палёў, урочышчаў, дарог, камянёў, частак вёсак і інш. Мікратапаніміка даследуе паходжанне гэтых назваў, іх сэнсавае значэнне, развіццё, сучасны стан, вымаўленне і напісанне. Аналіз такіх найменняў дае каштоўны матэрыял длягісторыі, геаграфіі, археалогіі, этнаграфіі, дыялекталогіі, лінгвагеаграфіі і іншых навук.

Носьбітамі мікратапонімаў з’яўляюцца мясцовыя жыхары, але, на жаль, з цягам часу гэтыя назвы забываюцца і страчваюцца, бо сыходзяць у нябыт людзі, якія выкарыстоўвалі гэтыя адзінкі. Назвы малых геаграфічных аб’ектаў на сённяшні дзень даследаваны недастаткова. На тэрыторыі Віцебшчыны іх вывучэннем пачалі займацца зусім нядаўна – на працягу апошняга дзесяцігоддзя. У сувязі з гэтым*актуальнасць*нашага даследавання не выклікае сумнення. *Мэта* артыкула – выяўленне і даследаванне семантыкі назваўкамянёў, што існуюць на тэрыторыі Віцебскай вобласці.

**Матэрыял і метады.** Даследаванне праводзілася на аснове матэрыялу, сабранага ў вёсках Таронкавічы (Лепельскі раён), Горкі (Шумілінскі раён), Вароніна (Сенненскі раён), Вялец (Глыбоцкі раён), аграгарадку Язна (Міёрскі раён), гарадах Орша, Полацк. Асноўнымі метадамі даследавання з’яўляюцца апісальны метад і метад сістэмнага аналізу.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Мікратапонімы фіксуюцца ў свядомасці і памяці многіх людзей у сувязі з фактарамі гістарычнага, геаграфічнага і сацыяльнага характару. Калі мы вандруем па сваёй малой радзіме, то нам здаецца, што мы ведаем пра яе ўсё ці амаль усё. Але гэта не так: кожны раз мы адкрываем для сябе нешта новае і раней невядомае. Камяням чалавек надаваў асаблівае значэнне, бо нельга дакладна сказаць, адкуль яны з’яўляюцца ў пэўнай мясцовасці і якія падзеі могуць быць з імі звязаны.Існуе нямала назваў камянёў, якія звязаны з падзеямі, што адбываліся на пэўных тэрыторыях. Да такіх адзінак у нашым матэрыяле мы аднеслі наступныя:

*Камень-Хлебнік* – гэта Барысаў камень, які знаходзіцца каля Сафійскага сабора ў Полацку. Раней ён ляжаў у рацэ, і па ўзроўні вады людзімаглі зразумець, які будзе год. Калі вады многа – будзе добры год і будзе хлеб. Калі вады мала – будзе засуха і людзі застануцца без хлеба (горад Полацк).

*Камень “Таварыства вольных літаратараў”* – адносна малады мікратапонім. “Таварыства вольных літатаратараў”– гэта літаратурная суполка, заснаваная 8 мая 1993 года. Складаецца пераважна з пісьменнікаў двух беларускіх рэгіёнаў – Полаччыны і Гродзеншчыны. Галоўны каардынатар – Алесь Аркуш. На дзесяцігоддзе таварыства калектыўна выбіла эмблему сваёй суполкі на валуне, які знаходзіцца недалка ад ракі Палата насупраць Верхняга замка (горад Полацк).

*Сямігаюн*– камень, што ляжыць на левым беразе Дняпра ў Оршы. Да нашых часоў дайшло паданне, у якім якое расказваецца пра семярых братоў, што захварэлі ў Смаленску, гараджане выгналі іх з горада. Браты знайшлі валун і каля яго хаваліся ад ветру і дажджу. Аднойчы яны заўважылі, што гэты валун застаецца сухім і цёплым. Леглі спаць каля яго, а раніцай былі ўжо здаровыя і моцныя. Менавіта таму гэты камень і носіць назву Сямігаюн (горад Орша).

*Камар* –камень, што размяшчаецца недалёка ад Дняпра. Гэтае месца людзі лічаць самым страшным на Аршаншчыне: бытуе легенда, што на гэтым камені адпачывалі русалкі, вадзянікі, ведзьмы, нячысцікі. А Камар-камень мог хавацца пад вадой, а потым нечакана з’яўляцца на паверхні і перашкаджаць судам. Таму яго падарвалі ў пачатку XIX стагоддзя (горад Орша).

*Ахвярнік* – камень, які мае цікавую гісторыю: раней ўлетку жанчыны прыносілі сюды немаўлят, клалі на гэты цёплы камень і прасілі здароўя для дзіцяці (вёска Таронкавічы Лепельскі раён).

Выяўлены найменні, дадзеныя па знешніх характарыстыках каменя. Так, *Рабінавы камень*, які знаходзіцца ў лесе, атрымаў сваю назву па колеры дрэва рабіны. Бытуе павер’е, што каб чалавеку пашанцавала, трэба абысці гэты камень вакол тры разы (вёска Таронкавічы Лепельскі раён).

Дастаткова распаўсюджанымі на тэрыторыі Віцебшчыны з’яўляюцца так званыя “чортавы” камяні, якія сустракаюцца ў самых розных кутках вобласці. Кожны з такіх камянёў мае сваю гісторыю і паданні, звязаныя з ім.Са старажытнасці камяні шанаваліся людзьмі, да іх прыносілі ахвяраванні. У нашым матэрыяле мы разгледзім 4 такія прыклады:

*Чортаў камень* – неафіцыйная назва валуна (афіцыйная – Талеркавы камень). Камень мае назвычай вялікія памеры, большая яго частка схавана пад зямлёй. Знешне надзямельная частка мае плоскую і адносна роўную форму. Па легендзе, пад гэтым каме-

нем схаваны скарб, пакінуты полацкім князем Усяславам Чарадзеем, які быў звязаны з нячыстай сілай (аграгарадок Язна Міёрскі раён).

*Чортаў камень* – камень, што лічылі домам нячысціка, які быў здольны да кравецкай справы. Згодна з паданнем, людзі клалі на гэты камень палатно і грошы, а ўжо на наступны дзень забіралі гатовае адзенне. Часта нячысціка можна было ўбачыць на валуне. Мясцовы чорт адрозніваўся тым, што добра ставіўся да людзей, асабліва бедных. Але не любіў п’яніц і часта здзекваўся з мужчын, якія ехалі з карчмы (вёска Вароніна Сенненскі раён).

*Чортаў камень* – валун ружовага граніту, што знаходзіцца на паўднёвы захад ад возера Вялец, што на Глыбоччыне. На камені захавалася каля 30 ямак дыяметрам 5–6 см і глыбінёй каля 3 см. Сценкі ямак загладжаныя, адшліфаваныя і, відавочна, узніклі ад вярчэння цвёрдых прадметаў. Паводле аднаго з паданняў, на камені скакаў і кружыўся чорт, і ад яго пятак утварыліся ямкі. Паводле іншага – гэты камень падабраў чорт і хацеў ім разбурыць касцёл (вёска Вялец Глыбоцкі раён).

*Чортаў камень* – самы вялікі валун у Беларусі. Вышыня над зямлёю – каля 3 метраў, яшчэ мінімум 3 метры – пад зямлёю. Мае такую назву з-за сваіх вялікіх памераў (вёска Горкі Шумілінскі раён).

**Заключэнне.**Такім чынам, назвы камянёў, што сустракаюцца на тэрыторыі Віцебскай вобласці, вылучаюцца багаццем і разнастайнасцю прыкмет, пакладзеных у аснову іх наймення. Адной з самых пашыраных з’яўляецца група назваў, звязаных з пэўнымі падзеямі, што раней адбыліся на тойтэрыторыі, дзе сёння знаходзяцца камяні.Дастаткова шматлікай з’яўляецца група найменняў, звязаных з нячыстай сілай.

1. Адамовіч, Я.М. Мікратапанімічныя назвы / Я.М. Адамовіч. – Мінск: Вышэйшая школа, 1971. – 112 с.
2. Ономастика Беларуси. Топонимия: учебник / А.М. Мезенко [и др.]; под ред. А.М. Мезенко. – Минск: РИВШ, 2018. – 320 с.
3. Шклярык, В.А. Мікратапанімія Усходняга Палесся ў кантэксце развіцця рэгіянальнай лексічнай сістэмы / В.А. Шклярык ; навук. рэд. І.Л. Капылоў. – 2-е выд. – Мінск: Беларуская навука, 2019. – 196 с.
4. Мезенка, Г.М. Беларуская антрапанімія: вучэбны дапаможнік / Г.М. Мезенка (навук. рэд.) [і інш.] – Віцебск : УА “ВДУ імя П.М. Машэрава”, 2009. – 254 с. – URL: https://rep.vsu.by/bitstream/123456789/2378/5 (дата звароту: 06.09.2022).

## РЕЦЕПЦИЯ ТВОРЧЕСТВА Ч. АЙТМАТОВА В КИТАЙСКОЙ ЛИТЕРАТУРНОЙ СРЕДЕ

***Заикин А.В.,***
*магистрант ВГУ имени П.М. Машерова, г. Витебск, Республика Беларусь*
*Научный руководитель –* ***Подставленко В.Ф.,*** *канд. филол. наук, доцент*

Ключевые слова. Ч. Айтматов, творчество, проза, авторский стиль, этнопроза, малые народы, читательский интерес, литературная среда.

Keywords. Tsch. Aitmatov, creativity, prose, author's style, ethnoprose, small nations, reader's interest, literary environment.

Даже в ситуации, когда в художественной литературе популярны универсальные или наднациональные концепты, константно значимым остается этнонаправление, идейно ориентированное на авторское раскрытие национального своеобразия отдельного народа. Среди ярких представителей данного направления в XX веке стоит выделить Чингиза Айтматова, чей художественный мир существенно повлиял и на литературу последующих поколений. Интересно отметить, что и сейчас есть много его последователей в зарубежье. Например, известно, что творчество киргизского классика любимо у китайских авторов и читателей.

Цель исследования – раскрыть факты популярности прозаического наследия Чингиза Айтматова в рамках китайской литературной среды.

**Материал и методы.** Материалом исследования в статье послужили литературно-критические работы современных китайских переводчиков, критиков и литературоведов (Гу Синя, Чэнь Сюэсюня, Ши Цзиньсю и др.). Основными для научного анализа отобраны приемы конкретно-исторического и структурно-типологического методов.